ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 8 (1041) | ЧАЦВЕР, 24 красавіка 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Плоды сотрудничества

## НА ПУТИ В ЕВРОПЕЙСКОЕ СООБЩЕСТВО

**Современной образовательной моделью в Европе является многоступенчатая система подготовки специалистов. И если к ней в Беларуси только начался постепенный переход, то студенты Франко-белорусского института управления, который действует при нашем университете, обучаются по этой схеме уже с 1995 г. (время создания ФБИУ на основе договоров о сотрудничестве между ГГУ имени Ф. Скорины и университетом Овернь – Клермон-Ферран). Получив одновременно два образования – на экономическом или юридическом факультетах ГГУ и в ФБИУ, выпускники могут работать как на белорусских и совместных предприятиях, так и сотрудничать с зарубежными партнерами, в частности, с Францией. Эти молодые специалисты получают доступ в европейское сообщество.**

Глубоко символично, что на церемонию вручения дипломов выпускникам Франко-белорусского института управления в наш университет дважды приезжал посол Франции в Республике Беларусь. 10-го апреля состоялся визит к нам третьего по счету французского посла в нашей стране – Стефана Шмелевского. Как он сам отметил, в этой должности он пока что только 5 месяцев и это его первый приезд в г. Гомель, в ГГУ им. Ф. Скорины. А создание совместного института он расценил как один из важнейших пилотных проектов для посольства Франции в Беларуси, который имеет большие перспективы.

Согласно учебного плана в ФБИУ для чтения лекций, проведения деловых игр со студентами разных курсов приезжала и группа французских преподавателей во главе с вице-президентом Университета Овернь–Клермон-Ферран-1, директором Университетского профессионализированного института «Менеджмент и управление предприятиями», содиректором ФБИУ Морисом Шеневуа. В составе делегации были студенческий вице-президент университета Мари-Антуанет Дюбост, Роза Кампос, Мириам Жозьён, Софи Родьер, Франсуа Касьер, Жан-Поль Рауль, Николай Чернёв, а также тридцать девять французских студентов.

Кульминационным моментом пребывания французских гостей и коллег в ГГУ стало вручение послом Стефаном Шмелевским дипломов 15 выпускникам Франко-белорусского института управления. Эта торжественная церемония прошла в конференц-зале библиотеки главного корпуса. Ректор ГГУ профессор М.В. Селькин горячо приветствовал высоких гостей, от имени всего руководства поблагодарил их за то, что совместными усилиями в ГГУ создано и успешно функционирует достойное европейское учебное заведение. Он также выразил уверенность в том, что полученные гомельскими студентами французские дипломы будут обязательно востребованы.

Выступление посла Стефана Шмелевского исключительно на французском языке студенты ФБИУ прекрасно понимали без перевода и тоже по-французски задавали ему вопросы, на которые получили исчерпывающие ответы.

На торжественной церемонии выступил также Морис Шеневуа, который подчеркнул, что Франко-белорусский институт управления в ГГУ явился той моделью совместного высшего учебного заведения, которая позже была перенесена и в другие университеты Беларуси.

Во второй половине дня Стефан Шмелевский посетил Франко-белорусский институт управления, где детально знакомился с его учебной базой, общался с преподавателями и студентами. В конце он поделился своими впечатлениями обо всем, что увидел:

– У меня очень положительные эмоции. Когда я был в учебных аудиториях, то слышал, как студенты говорят по-французски, видел лежащие на столах учебники, тоже на французском языке… И если закрыть глаза, было такое ощущение, будто я в Клермон-Ферране. Я считаю, что это очень положительный факт и смотрю на будущее этого совместного проекта, вашего университета с большим оптимизмом.

**Т.НИКОЛАЕВА.**



**На снимке (слева направо): вице-президент Университета Овернь – Клермон-Ферран-1 Морис Шеневуа, посол Франции в Республике Беларусь Стефан Шмелевский, содиректор ФБИУ А.В. Гаврилюк, ректор ГГУ М.В. Селькин во время встречи в ректорате.**

**Фото В. ЧИСТИКА.**

## ТАЛЕНТАМ ЮНЫХ – ДАРОГУ!

Знаёміцца з багаццем самых разнастайных экспанатаў – ад сучасных мадэляў да забаўных цацак, сабраных на выстаўцы тэхнічнай творчасці навучэнцкай моладзі, якая працавала на працягу тыдня ў нашым універсітэце, без захаплення было цяжка. Дык вось што, аказваецца, могуць зрабіць уласнымі рукамі юныя Кулібіны, калі іх талент і фантазію своечасова заўважыць, падтрымаць і накіраваць у правільнае рэчышча!

Выстаўка з'явілася маляўнічым афармленнем XIV Рэспубліканскага конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці навучэнцаў, які сёлета невыпадкова ўпершыню праводзіўся менавіта на базе ГДУ. Наш універсітэт – на сённяшні дзень адзіная ў Беларусі ВНУ, дзе рыхтуюць кадры па спецыяльнасці "Фізіка і тэхнічная творчасць" для выкладання фізікі і работы са здольнымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі ў гуртках, клубах, дамах і цэнтрах дзіцячай творчасці.

З вялікай арганізацыйнай работай па падрыхтоўцы і правядзенні гэтага маштабнага мерапрыемства выдатна справіліся кіраўніцтва ГДУ, фізічнага факультэта, яго выкладчыкі, студэнты, а таксама выпускнікі спецыяльнасці "Фізіка і тэхнічная творчасць". А больш за ўсё клопатаў дасталося вялікім энтузіястам сваёй справы, сапраўдным "мэтрам" мадэлізму, кіраўнікам СТК ГДУ "Электроніка" і "Мадэліст-канструктар", ст. выкладчыкам кафедры агульнай фізікі І.М. Якаўцову і У.А. Замятніну.

Удзельнікі конкурсу ( а іх было звыш 100 чал. у складзе 8-ці каманд) трымалі сур'ёзныя выпрабаванні – абаранялі свае праекты ў 7 секцыях навукова-практычнай канферэнцыі, рашалі задачы па фізіцы з тэхнічным ухілам, праяўлялі свае здольнасці ў рабоце творчай майстэрні. Журы вызначала лепшыя вынікі па ўсіх гэтых накірунках, складала агульную суму балаў, каб назваць каманды-пераможцы. Імі сталі юныя творцы з РЦТТН, г. Мінска, Гомельскай вобласці. Каманда г. Гомеля заняла 5-е месца. У асабістым заліку абсалютным пераможцам стаў вучань СШ № 56 г. Гомеля Юрый Грышачкін.

Конкурс стаў сапраўдным святам для ўсіх яго ўдзельнікаў, феерверкам дзіцячых талентаў.



**На здымку: выпускнік фізічнага факультэта ГДУ 1995 г. выкладчык фізікі вышэйшай катэгорыі І.У. Волкаў разам са сваімі выхаванцамі, сямікласнікамі Чырвонабярэжскай СШ-садка Жлобінскага раёна В. Якаўлевым і В. Хулупам, якія прадставілі на выстаўку шэраг найцікавейшых работ фізіка-тэхнічнага гуртка "Электрон".**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

Імі ганарыцца універсітэт

**Святлана Лін цвёрда ўпэўнена: самая галоўная каштоўнасць у чалавечых адносінах – вернасць. Таму яна аддае перавагу сардэчным гутаркам з лепшымі сябрамі, а не шумным кампаніям.**

## *РЭАЛІСТ І ... РАМАНТЫК*



– У жыцці я імкнуся быць рэалістам, – гаворыць Святлана, – і паступова адвыкаю ад ружовых акуляраў. Але часам, каб адпачыць душой, люблю памарыць, паглядзець старыя кінастужкі, нярэдка чытаю казкі, захапляюся і фантастыкай.

З аднаго боку, у душы застаючыся летуценнікам, стыпендыятка імя Ф. Скарыны цвяроза глядзіць на жыццё: гэтага патрабуюць і спецыяльнасці, якія яна атрымлівае ў ГДУ. Дзяўчына вучыцца на 5 курсе эканамічнага факультэта (спецыяльнасць "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве") і завочна атрымлівае яшчэ адну – "Правазнаўства".

Да нядаўняга часу С. Лін даследавала праблему глабалізацыі эканомікі Рэспублікі Беларусь, яе месца ў сістэме гаспадарчых адносін. З 1-га курса пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры эканамічных тэорый Барыса Уладзіміравіча Сарвірава студэнтка актыўна публікавалася ў навуковых часопісах Беларусі, Расіі і Польшчы. Зараз ва ўмовах эканамічнага рэфарміравання ў нашай краіне яе цікавяць шляхі прыцягнення замежных інвестыцый у айчынную вытворчасць. І Святлана пад кіраўніцтвам д.э.н., прафесара кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю У.К. Драчова распрацоўвае гэту праблему ў сваёй дыпломнай рабоце. Яе вынікі будуць мець важнае практычнае прымяненне, таму што рэальная распрацоўка тэмы вядзецца на базе СП "Рэчыцапіва".

Святлана Лін поўная рашучасці ў здзяйсненні намечаных планаў. І галоўнай крыніцай сваіх сіл і цярпення лічыць любоў і ўвагу сям'і, надзейнасць верных сяброў.

**Т.ЦЕЛЯХОВІЧ.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## ЗА ЧЫСЦІНЮ І ПАРАДАК У НАШЫМ АГУЛЬНЫМ ДОМЕ

**2003 г. аб'яўлены ў нашай рэспубліцы годам добраўпарадкавання на Зямлі.**

Безумоўна, гэта не азначае, што клапаціцца аб чысціні навакольнага асяроддзя, узорным санітарным стане нашых гарадоў і вёсак, іх вуліц і двароў, тэрыторый вакол устаноў, арганізацый і прадпрыемтваў мы абавязаны толькі ў вызначаны адрэзак часу. Самае галоўнае – усвядоміць кожнаму з нас, што Зямля – наш агульны дом і ў ім, як ў дбайнага гаспадара, парадак павінен быць заўсёды. А гэта залежыць, у першую чаргу, ад чысціні ў нашых душах, усведамлення адказнасці за будучыню, якую ствараем сваім дзецям.

Гомельскім гарвыканкамам на бягучы год распрацавана шырокая праграма па добраўпарадкаванню нашага абласнога цэнтра, у выкананні якой актыўна далучыцца абавязаны і мы – яго жыхары. Як адзначае мэр горада М.В. Барабанаў, трэба мяняць псіхалогію людзей, якія навядзенне парадку і чысціні лічаць толькі клопатам гарадскіх улад, адпаведных службаў, а самі не прытрымліваюцца элементарных норм у сваіх паводзінах на вуліцах, у парках ... Каб у нас было прыгожа і чыста, працаваць неабходна разам!

У рамках названай праграмы зараз праходзіць месячнік па санітарнай ачыстцы горада, рашэннем гарвыканкама аб'яўлены агляд-конкурс сярод прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў па азеляненню прылягаючых да іх тэрыторый.

Актыўная работа па навядзенню ўзорнай чысціні каля вучэбных карпусоў, інтэрнатаў, у студэнцкім парку праводзіцца зараз і ў нашым універсітэце. На кожным факультэце распрацаваны планы неабходных мерапрыемстваў па добраўпарадкаванню, якія будуць абавязкова выконвацца.

**********************************

### З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта ст.выкладчык кафедры беларускай мовы* ***КІСЯЛЁВА Валянціна Аляксееўна*** *і ст.выкладчык кафедры бухуліку, кантролю і АГД* ***УШАК Таццяна Усеваладаўна*** *ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта дацэнт кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы* ***БАГАЦІКАВА Людміла Іванаўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры агульнай фізікі горача віншуюць **КУРЫЛКІНУ Святлану Мікалаеўну** з прысваеннем ёй Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання прафесара.

### ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі і студэнты горача віншуюць **АЎДОНІНУ Таццяну Віктараўну** з кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, **СЦЕПАНЮК Валянціну Кузьмінічну** з кафедры філасофіі, **АГЕЕНКА Ірыну Уладзіміраўну** з кафедры АСАІ, **Квяцінскага Станіслава Станіслававіча** з кафедры фізвыхавання і спорту з прысваеннем ім Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта.

